## З ВОПЫТУ АДНАЎЛЕННЯ ТРАДЫЦЫЙНАГА АДЗЕННЯ ВІЦЕБШЧЫНЫ

*Г.А. Бабровіч, Н.А. Бабровіч*
*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*

Віцебшчына на сваёй тэрыторыі ахоплівае тры гісторыка-этнаграфічных рэгіёна: Беларускае Падзвінне (сярэдні басейн Заходняй Дзвіны), паўночную частку Падняпроўя, невялічкую паўночна-заходнюю частку Панямоння; і мяжуе са Смаленскай, Пскоўскай губерніямі Расійскай Федырацыі, Латвіяй, Літвой [1]. Кожны з іх мае свае адметныя рысы традыцыйнай культуры і адзення, а на сумежжы бытуюць пераходныя формы, якія дэманструюць узаемаўплывы і дынаміку развіцця міжэтнічных кантактаў. Адзінства традыцыйна-бытавой культуры на сумежжы абумоўлена шырокім распаўсюджваннем беларускага этнасу па-за тэрыторыяй сучаснай Рэспублікі Беларусь.

Мэта гэтага артыкула – прааналізаваць захаванасць, стан вывучанасці пытанняў аб традыцыйных комплексах адзення Віцебшчыны, а таксама сітуацыю, якая склалася ў практыцы аднаўлення.

**Матэрыял і метады.** Для стварэня поўных адноўленых комплексаў народнага адзення, якія на тэрыторыі Беларусі прынята называць строямі асноўнай візуальнай базай з’явіліся замалёўкі з натуры тыповых вобразаў мясцовых жыхароў Фёдара Сонцава ў 1844 г. і Міхася Баразны ў 1956–58-х гг., мастацка-графічныя рэканструкцыі традыцыйных строеў канца XIX – першай паловы XX стагоддзяў Міхася Раманюка, Марыі Віннікавай і Юрыя Піскуна створаныя ў 1990–2000-х гг. [2]. У працы выкарыстоўвалася сукупнасць тэарэтычных і эмпірычных метадаў даследавання: тэарэтычны аналіз і сінтэз эмпірычных дадзеных; тэарэтыка-метадалагічны аналіз педагагічнай і гістарычнай літаратуры; эмпірычныя, прыватныя метады (вывучэнне дакументаў).

**Вынікі і іх абмеркаванне**. Ва ўсходніх раёнах Падняпроўя ў жаночым касцюме атрымаў распаўсюджанне асаблівы тып адзення ў выглядзе доўгага андарака з прышытым да яго кароткім ліфам, які на Віцебшчыне меў назвы “сая/н”, “андарак з каба/там”, “каба/т”. На гэтай жа тэрыторыі бытавалі сарочкі “галаплечкі” – з вузкай абшэўкай гарлавіны замест каўняра. Варыянты такога адзення былі вядомы і на тэрыторыі суседняй Смаленшчыны. З пачатку XX стагоддзя ў народным тэкстылі Падняпроўя, у тым ліку і касцюме, пачала хутка распаўсюджвацца вышыўка крыжам, разам з якой з’явіліся стылізаваныя раслінныя матывы, а дадаткова да чырвонага пачаў актыўна ўводзіцца чорны колер.

“К канцу XIXст., калі абуджаная сацыял-дэмакратычным рухам нацыянальная інтэлігенцыя пачала збіраць рэчы матэрыяльнай культуры беларусаў Віцебшчыны, то адзення з саматканкі засталося мала. Патрабуюцца намаганні, каб засведчыць багатыя традыцыі мастацтва беларускага нацыянальнага касцюма ў Смаленскай і Пскоўскай вобласцях РСФСР, на тэрыторыі Латвіі” – адзначаў Міхась Раманюк на пачатку новай хвалі адраджэння ў XXстагоддзі цікаўнасці і ўважлівага вывучэння ўстойлівых комплексаў народнага касцюма з мэтайзахавання і аднаўлення.

Падзвінне займае тэрыторыю Віцебскай вобласці, за выключэннем яе паўднева-ўсходней часткі – Аршанскага, Дубровенскага і Талачынскага раёнаў, якія адносяцца да Падняпроўя, і невялікай заходняй часткі Пастаўскага раёна, якая ўваходзіць у склад Панямоння.

Мясцовае народнае адзенне жыхароў Падзвіння адрознівалася прыкметнай разнастайнасцю тыпаў і спосабаў упрыгожвання. З верхняга адзення ў шырокім ужытку быў лёгкі зрэбны кафтан (насоў, кізель), які насілі амаль ва ўсе поры года. Зімовы варыянт гэтага адзення – знізак (ці сходак) рабіўся карацейшым, часам прыталеным; яго надзявалі пад кажух або світу (армяк). Найбольш распаўсюджаны колер адзення – белы. Давалі разнастайнае жаночае паясное адзенне – спадніцы, сарафаны, узорныя саяны, андаракі, дрыліхі, што адрозніваліся паміж сабой асаблівасцямі канструкцыі і стылю, расфарбоўкай і матэрыяламі. Агульную архітэктоніку народнага касцюма вызначаў просты свабодны крой. Індывідуальныя характарыстыкі пераносіліся не столькі на канструкцыю і крой, колькі на дэкаратыўнае афармленне.

Рэпазіторый ВДУ

Ва ўзорнай тэхніцы ўпрыгожванняў апрача звычайных спосабаў (вышыўкі, карункавага арнаменту, мярэжкі) важнае месца ў гэтым рэгіёне займала набойка. У вышыўцы дамінаваў чырвоны колер, у набойцы – сіні ці блакітны. Мясцовыя майстры набойкі (сінельнікі) выраблялі спецыяльныя ўзорныя дошкі, з якімі яны хадзілі па навакольных вёсках, задавальняючы заказы мясцовага насельніцтва. Аснову ўзорных матываў набойкі складалі стылізаваныя выявы мясцовай флоры, блізкія і знаёмыя ўсім палявыя рамонкі, незабудкі, гарошак, суніцы і інш., якія нярэдка спалучаліся з геаметрычным арнаментам [3, 8.].

Сіні колер пераважаў і ў каларыце тканых клятчастых спадніц Падзвіння, якія вылучаліся тонкай лінейнай распрацоўкай дэкору. Традыцыйна спадніцы шыліся з чатырох прамых полак, аднак з пачатку ХХ ст. папулярнымі сталі варыянты, пашытыя ў кліны. Разнастайнасць спадніц адзначана ў назвах: “спадніца”, “сая/н”, “дры/ліх”, “бе/лька”, “саматка/лка”, “андара/к” і інш. Вялікая ўвага надавалася таксама фартухам, якія шылі з як з фабрычных тканін, так і з саматканак, іншы раз выраблены у складаных тэхніках ткацтва. Іх упрыгожвалі па нізе бардзюрамі бранага або вышытага арнаменту, мярэжкамі, самаробнымі карункамі.

Заходняя частка Пастаўскага раёна Віцебскай вобласці знаходзіцца на тэрыторыі гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Панямонне. На сённяшні дзень мы маем малую захаванасць і разрозненасць аўтэнтычнага матэрыялу, што не дазваляе вылучыць усе лакальныя варыянты традыцыйнага касцюма, якія існавалі на гэтай тэрыторыі. Тым не менш, матэрыялы літаратурных крыніц, музейных калекцый і экспедыцыйныя даныя даюць магчымасць выявіць найбольш адметныя рысы касцюма Панямоння [4, 35].

Навуковыя рэканструкцыі малавядомых і страчаных беларускіх строяў знаходзяць матэрыяльнае ўвасабленне ў працах сучасных майстроў народнай творчасці, адноўленых у Дамах і Цэнтрах рамёстваў Віцебскай вобласці. Строі адноўлены як на падставе папярэдніх навуковых даследаванняў, так і матэрыялаў, якія збіраліся супрацоўнікамі Домаў і Цэнтраў рамёстваў ў шматлікіх экпедыцыях па раёнах, ў розных музеях Беларусі, Расіі, Латвіі і Літвы.

Адноўленыя строі размеркаваны па раздзелу адпаведна прыналежнасці да пэўнага гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна. Месца бытавання канкрэтнага строя указанапа тэрыторыям раёнаў Віцебскай вобласці.

**Заключэнне.** Касцюмныя комплексы, якія бытавалі ў акрэсленым рэгіёне і сумежжы, аднаўляліся на падставе аўтэнтычных прадметаў адзення з музейных фондаў, збораў розных устаноў культуры і адукацыі, прыватных асоб. У выпадку адсутнасці ў калекцыях асобных кампанентаў, іх канструктыўныя і мастацка-стылістычныя вобразы рэканструяваліся па аналогіям з прадметамі з тэрыторый суседніх рэгіёнаў. Асаблівая ўвага выбару вобразаў для аналогій надавалася тым тэрыторыям, якія ў розныя часы мелі агульнае гістарычнае прошлае. Адноўленыя варыянты выраблены з сучасных матэрыялаў, але на падставе аўтэнтычных узораў і з выкарыстаннем старажытных тэхналогій. Фотамадэлі, якія прымалі ўдзел у фотасесіях, пераважна абіраліся па прынцыпу нараджэння і пастаяннага жыхарства на тэрыторыях бытавання пэўнага строя. Такім чынам было дасягнута максімальнае набліжэнне да аднаўлення поўнага вобраза былых жыхароў Віцебшчыны розных гістарычных часоў іх нашчадкамі.


1. Цітоў, В. С. Этнаграфічная спадчына: Беларусь: краіна і людзі [Тэкст] / В.С. Цітоў. - 2-е выд. - Минск : Беларусь, 2001.
2. Вайткевіч, В.С, Раманюк, М.Ф. Адзенне / Этнаграфія Беларусі. Энцыклапедыя. Мн., 1989.
3. Раманюк, Ф. Мастацтвазнаўча-этнаграфічнае раяванне Паазер’я (па матэрыялах традыцыйнага нацыянальнага касцюма беларусаў XIX– першай паловыXX стагоддзяў) / Навукова-практычная канферэнцыя “Гістарычнае і народнае адзенне Віцебшчыны”. Матэрыялы канферэнцыі, красавік 1991 год.Віцебск, 1992.
4. Віннікава, М.М. Традыцыйны беларускі касцюм – Традиционный белорусский костюм = Traditionalbelarussiancostume: альбом / Марыя Віннікава, Паліна Богдан. – Мінск: Беларуская навука, 2016.


## ДИАЛОГ С ОКРУЖАЮЩИМ ПРОСТРАНСТВОМ В ТВОРЧЕСТВЕ ВАЛЕНТИНЫ ШОБА


*В.В. Васильева*
*Новополоцк, УО «ПГУ»*


Каждый художник это целый мир, неизведанный и глубокий. И эта глубина, на которой находятся самые невероятные образы, идеи и задумки раскрывается перед нами всякий раз, когда художник знакомит нас со своим миром, сквозь картины, которые он создал. Так же и вы-



Репозиторий ВГУ